УЖЫВАННЕ АНГЛАМОЎНАЙ ЗАПАЗЫЧАНАЙ ЛЕКСІКІ КУЛІНАРНАЙ СФЕРЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Савасцюк М.Л.

Беларускі дзяржаўны універсітэт

Анатацыя: У артыкуле разглядаюцца некаторыя пытанні, звязаныя з ужываннем англіцызмаў кулінарнай сферы ў беларускай мове: прапанавана размеркаванне англамоўных лексічных адзінак па лексіка-семантычных групах, прааналізавана актыўнасць працэса запазычвання кулінарнай лексікі з англійскай мовы за апошнія сорак гадоў.

Ключавыя словы: англамоўныя запазычанні, англіцызмы, беларуская мова, запазычанне, запазычванне, кулінарная лексіка.

Пад уплывам працэсу глабалізацыі і, адпаведна, актыўнага ўзаемадзеяння моў свету за апошнія дзесяцігоддзі шматлікія сферы грамадскага жыцця ўзбагаціліся новай лексікай. Не выключэнне і кулінарная сфера, якая апошнім часам актыўна развіваецца. У беларускую мову трапляюць лексемы з розных краін свету, у тым ліку і з англійскай. Функцыянаванне англамоўных запазычанняў кулінарнай сферы пытанне, якое патрабуе ўсебаковага даследавання і з’яўляецца актуальным, паколькі лексіка гэтай сферы актыўна ўжываецца носьбітамі мовы ў паўсядзённым жыцці.

Сярод вылучаных намі англіцызмаў беларускай мовы налічваецца 83 адзінкі кулінарнай сферы. Усе яны прадстаўлены назоўнікамі, паколькі з’яўляюцца назвамі прадметаў або з’яў, запазычаных з культур англамоўных краін.

Прапануем наступнае размеркаванне англіцызмаў па лексіка-семантычных групах:

1. **Назвы страў** (38 адзінак):

Барбекю ад barbeque, ад фр. barbecue. **Баўнці** ад bounty = *літар.* шчодрасць. **Бекон** ад bacon. **Бігмак** ад big Mac, ад big = вялікі + Mac(Donalds) = назва амерыканскай гастранамічнай фірмы. **Біфштэкс** ад beef-steaks = кавалачкі ялавічыны. **Бургер** ад burger. **Гамбергер** ад hamburger. **Джэм** ад jam. **Кекс** ад cakes = пірожныя. **Кетчуп** ад ketchup. **Корнфлэкс** ад corn flakes. **Крэкер** ад cracker. **Лаліпоп** ад lollipop. **Лівер** ад liver = печань. **Лумп** ад lump = грудка. **Лярд** ад lard. **Папкорн** ад popcorn, ад popped corn = *літар*. страляючая кукуруза. **Пікулі** ад picles, ад picle = саліць, марынаваць. **Пудынг** ад pudding. **Рамштэкс** ад rumpsteak. **Рол** ад roll = *літар*. скручваць. **Ростбіф** ад roastbeef, ад roast = смажыць + beef = ялавічына. **Слайс** ад slice. **Смузі** ад smoothie, ад smooth = *літар.* мяккі, аднародны. **Снікерс** ад "Snickers", ад snicker = хіхіканне. **Снэкі** ад snack = перакуска, закуска. **Спрэд** ад spread. **Стэйк** ад steak. **Сэндвіч** ад sandwich. **Тост** ад toast. **Фішбургер** ад fishburger, ад fish = рыба + (ham)burger = гамбургер. **Хот-дог** ад hot dog, ад hot = гарачы + dog = сабака. **Хэпі міл** ад happy meal, ад happy = шчаслівы + meal = ежа. **Чуінгам** ад chewing gum. **Чызбургер** ад cheeseburger, ад cheese = сыр + burger = бургер. **Чызкейк** ад cheese cake, ад cheese = сыр + cake = торт. **Чыпсы** ад chips, ад chip = луска. **Чэстар** ад Chester = назва графства і горада ў Англіі.

2. Назвы напояў (20 адзінак):

Брэндзі ад brandy. **Віскі** ад whisky. **Грог** ад grog. **Джын-тонік** ад gin = джын + tonic (water) = тонік. **Дрынк** ад drink. **Кактэйль** ад cocktail. **Кока-кола** ад Coca-cola. **Кола** ад (Coca)Cola. **Лонг-дрынк** ад long drink, ад long = доўгі + drink = напітак. **Пепермент** ад peppermint. **Пепсі** скарач. ад Pepsi (Cola) = гандлёвая марка. **Пепсі-кола** ад Pepsi-Cola = гандлёвая марка. **Портар** ад porter. **Пунш** ад punch. **Ром** ад rum. **Скотч** ад Scotch whisky = шатландскае віскі. **Фрэш** ад fresh = *літар.* свежы. **Шэры** ад sherry. **Шэры-брэндзі** ад cherry brandy. **Эль** ад ale.

3. Назвы прыстасаванняў (11 адзінак):

Барбекю ад barbeque, ад фр. barbecue. **Блэндар** ад blender, ад blend = змешваць. **Грыль** ад grill = смажыць. **Дэфростар** ад defroster, ад defrost = размарожваць. **Камбайн** ад combine = *літар.* спалучаць, аб'ядноўваць. **Міксер** ад mixer. **Міні-бар** ад minibar, ад mini- = маленькі + bar = бар. **Ростар** ад roaster, ад roast = смажыць. **Тостар** ад toaster, ад toast = падсмажваць хлеб. **Тэрмаспот** ад Thermo-Spot, ад гр. therme = цяпло + spot = пляма, месца. **Шэйкер** ад shaker, ад shake = трэсці, устрэсваць.

4. Назвы сістэм харчавання, напрамкаў у іх, форм і сістэм абслугоўвання (5 адзінак):

Веганства ад veganism. **Вегетарыянства** ад vegetarian, ад с.-лац. vegetarius = раслінны. **Тэйк-эвэй** ад take away = *літар.* выносіць. **Слоў-фуд** ад slow = павольны + food = ежа. **Фаст-фуд** ад fast food = *літар.* хуткая ежа.

5. Назвы прыёмаў ежы (3 адзінкі):

Барбекю ад barbeque, ад фр. barbecue. **Ланч** ад lunch. **Пікнік** ад picnic.

6. Назвы асоб па родах дзейнасці (3 адзінкі):

Бармен barman, ад bar = барная стойка + man = чалавек. **Веган** ад vegan. **Тытэстар** ад tea-tester, ад tea = гарбата + tester = які спрабуе.

7. Назвы ўстаноў харчавання (3 адзінкі):

Бар ад bar. **Грыль-бар** ад grill + bar. **Макдональдс** ад MacDonald's.

8. Назвы кулінарных працэсаў і з'яў (3 адзінкі):

Дэфрастацыя ад defrost = размарожваць. **Фаст-фуд** ад fast food = *літар.* хуткая ежа. **Тэйк-эвэй** ад take away = *літар.* выносіць.

Тэндэнцыю да павелічэння колькасці англіцызмаў кулінарнай сферы можна прасачыць, звярнуўшыся да табліцы. У ёй прадстаўлены англіцызмы, зафіксаваныя слоўнікамі беларускай мовы ў розныя часы, пачынаючы з 1978 года.

Англіцызм	ТСБМ, 1978-1984	Булыка, 1999	Булыка, 2005	Уласевіч, 2009	Піскуноў, 2012	Шчасная, 2012	Перыядычны Друк

Бар	+	+	+	+	+		+
Барбекю				+			+
Бармен	+	+	+		+		+
Баўнці							+ (1995)
Бекон	+	+			+		+
Бігмак			+	+			+
Біфштэкс	+	+			+		+
Блэндар				+			+
Брэндзі	+				+		+
Бургер			+	+	+		+
Веган							+
Веганства							+
Вегетарыянства	+	+			+		+
Віскі	+	+	+		+		+
Гамбургер		+	+	+	+		+
Грог	+	+	+		+		
Грыль		+	+	+	+		+
Грыль-бар			+	+	+		+
Джын	+	+		+			
Джын-тонік				+			+
Джэм	+	+			+		+
Дрынк				+			+
Дэфрастацыя		+			+		
Дэфростар		+			+		
Актэйль	+	+	+		+		+
Кекс	+	+	+		+		+
Кетчуп		+	+		+		+
Кока-кола	+	+	+	+	+		+
Кола							+ (2006)
Крэкер	+	+	+	+	+		+
Лаліпоп					+		

Ланч		+	+		+		
Лівер	+	+			+		
Лонг-дрынк				+			+
Лump		+			+		
Лярд	+	+			+		
Макдональдс				+	+		+
Міксер			+		+		+
Мінібар				+	+		+
Папкорн				+			+
Пермент		+			+		
Пепсі				+	+		+
Пепсі-коал		+	+	+	+		
Пікулі	+				+		
Портар	+	+			+		
Пудынг	+	+			+		
Пунш	+	+	+		+		
Рамштэкс	+	+			+		
Рол					+		+
Ром		+			+		+
Ростар				+			
Ростбіф	+	+			+		
Скотч				+	+		
Слайс							+ (2016)
Слоў фуд							+ (2017)
Смузі						+	+
Снікерс			+		+		+
Снэкі				+			
Снэк-бар				+			
Спрэд						+	+
Стэйк				+			+

Сэндвіч / сандвіч	+	+	+		+		+
Тост		+	+	+	+		+
Тостар		+ тосцер	+		+		+
Тытэстар		+			+		
Тэйк эвэй							+ (2015)
Тэрмаспот							+ (2005)
Файв-а-клок		+			+		
Фастфуд			+	+	+		+
Фішбургер			+	+	+		
Фрэш						+	+
Хот-дог			+	+	+		+
Хэпі міл							+
Чуінгам		+			+		
Чупа чупс				+	+		
Чызбургер			+	+	+		
Чызкейк							+
Чыпсы		+	+	+	+		+
Чэстар		+			+		
Шэйкер			+	+	+	+	+
Шэры				+	+		
Шэры-брэндзі				+	+		+
Эль	+	+			+		

З пункту гледжання колькаснага адлюстравання англіцызмаў мэтазгодна параўнаць “Тлумачальны слоўнік беларускай мовы” і “Вялікі слоўнік беларукай мовы” Ф. А. Піскунова як найбольш поўныя па аб’ёму лексікі за розная перыяды. ТСБМ у пяці тамах фіксуе нормы і тэндэнцыі, якія склаліся ў беларускай мове ў перыяд 1930 – 1980 гг. і з’яўляецца дастаткова поўным адлюстраваннем лексічнага стану беларускай мовы

названага перыяду [4]. Слоўнік утрымлівае каля 100 тысяч лексічных і фразеалагічных адзінак. Слоўнік Ф. А. Піскунова грунтуецца на асэнсаванні значнага аб'ёму беларускамоўных тэкстаў (больш за 70 млн ужыванняў) і адлюстроўвае рэальны стан сучанай беларускай мовы. У ім максімальна поўна падаецца лексіка, якая з'явілася і пашырылася за апошнія дзесяцігоддзі [3; с. III]. У "Вялікі слоўнік беларускай мовы" ўключана каля 223 тысяч слоў.

Што датычыцца лексікі кулінарнай сферы, ТСБМ налічвае 23 англіцызмы, у той час як у Слоўніку Ф. А. Піскунова фіксуецца 57 лексем англамоўнага паходжання. Відавочна, іх колькасць за тры дзесяцігоддзі павялічылася ў 2,5 разы. На наш погляд, на гэты працэс значна паўплывала адкрыццё першага рэстарана "Макдональдс" ў 1996 годзе і з'яўленне разам з ім культуры фастфуду, што непазбежна паспрыяла з'яўленню шэрагу англа-амерыканізмаў (бігмак, бургер, гамбургер і інш.). У выніку аналіза беларускамоўных лексікаграфічных і перыядычных выданняў намі зафіксавана 9 англіцызмаў, якія не сустракаюцца ў слоўніках беларускай мовы, але ўжываюцца ў газетах і часопісах, што сведчыць аб хуткім прытоку лексем кулінарнай сферы з англійскай мовы.

ЛІТАРАТУРА

1. Булыка, А. М. Слоўнік іншамоўных слоў: у 2 т. / А. М. Булыка. – Мінск : БелЭн, 1999. – 2 т.
2. Булыка, А. М. Слоўнік іншамоўных слоў. Актуальная лексіка / А. М. Булыка. – Мінск : ТАА «Харвест», 2005. – 336 с.
3. Піскуноў, Ф. А. Вялікі слоўнік беларускай мовы : арфаграфія, акцэнтуацыя, парадыгматыка : каля 223 000 слоў / Ф. А. Піскуноў. – Мінск : Тэхналогія, 2012. – 1207 с.
4. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / рэдкал. К. Атраховіч і інш.]. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыклапедыя, 1978 – 1984. – 5 т.

5. Уласевіч, В. І. Слоўнік новых слоў беларускай мовы / В. І. Уласевіч, Н. М. Даўгулевіч. – Мінск : ТетраСистемс, 2009. – 448 с.

6. Шчасная, К. Д. Слоўнік новай і актуальнай лексікі / К. Д. Шчасная; пад рэд. В. П. Русак. – Мінск : Права і эканоміка, 2012. – 102 с.